Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

30 КРАСАВІКА 2020 г. ЧАЦВЕР № 83 (29197)

## Сімвал салідарнасці працоўных

*Паважаныя суайчыннікі!*

*Прыміце самыя сардэчныя віншаванні са Святам працы.*

*Першамай сімвалізуе салідарнасць працоўных, сціraе межы паміж краінамі і пакаленнямі.*

*Для жыхароў Беларусі стваральная праца на роднай зямлі пад мірным небам заўсёды была і застаецца найвялікшай каштоўнасцю. У нашай краіне пашаны і падзякі заслугоўваюць усе працоўныя калектывы, ветэраны працы, маладыя спецыялісты, кожны, хто робіць свой унёсак у агульнае дабро, робіць Айчыну багацейшай і прыгажэйшай.*

*Мы ствараем будучыню на прынцыпах сацыяльнай справядлівасці, бязмежнай павагі да неабыякавых і таленавітых прафесіяналаў, якія, не шкадуючы сіл, гатовыя вырашыць самыя складаныя задачы, што стаяць перад дзяржавай, і абараніць наш народ ад любых напасцяў.*

*Перакананы, разам мы справімся з усімі выклікамі часу.*

*Жадаю вам моцнага здароўя, згуртаванасці ў калектывах, любові ў сем'ях. Хай кожны новы дзень прыносіць радасць і выдатны вясновы настрой.*

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр ЛУКАШЭНКА.**

# На высокім узроўні



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**У цэнтры сталіцы, на вуліцы Магілёўскай, спецыялісты прадпрыемства «Прамэкс» будуюць шматузроўневы паркінг на 240 машына-месцаў.**

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Эдуард ТАМІЛЬЧЫК, начальнік галоўнага ўпраўлення выхаваўчай работы і маладзёжнай палітыкі Міністэрства адукацыі:**

*«Да 2020/2021 навучальнага года ў адукацыйным працэсе будуць выкарыстоўвацца абноўленыя навучальныя праграмы і дапаможнікі па прадметах «Сусветная гісторыя», «Гісторыя Беларусі» для 10 класа, а да 2021/2022 навучальнага года — для 11 класа, у змест якіх будуць уключаны найноўшыя даследаванні гістарычнай навукі. Адным з патрабаванняў да стварэння новых навучальных дапаможнікаў з'яўляецца рэалізацыя прынцыпу навуковасці — адпаведнасць зместу вучэбнага матэрыялу ўзроўню сучаснага развіцця навукі, дакладнасць выкладання фактаў, законаў, прынцыпаў, тэорый».*

## КОРАТКА

- **On Air марафон «Беларусь памятае. Кветкі Вялікай Перамогі» пройдзе 5–8 мая.**
- Прафіцыт рэспубліканскага бюджэту ў I квартале склаў Br0,2 млрд.
- **«Луч» выпусціў лімітаваную калекцыю гадзіннікаў да 75-годдзя Перамогі.**
- Міжнародная фармкампанія перадасць Беларусі патэнцыйна эфектыўны для лячэння COVID-19 прэпарат.

Руплівым гаспадарам

## КАЛЯРОВАЯ БУЛЬБА І АРЭХАВЫЯ САДЫ

### Што вучоныя прапануюць для прысядзібных участкаў




**Нарэшце мы дачакаліся сапраўднай вясны. Начныя замаразкі скончыліся, глеба прагрэлася да 8 градусаў — а гэта значыць, можна садзіць бульбу. Прычым лепш айчыннай селекцыі. Як паведаміў генеральны дырэктар РУП «Навукова-практычны цэнтр па бульбаводстве і агародніцтве» Вадзім МАХАНЬКО, попыт беларусаў на айчынныя сарты з кожным годам павялічваецца. Ва ўсякім разе, сёлета зваротаў па насенне ў магазін навукова-практычнага цэнтра было ў два разы болей, чым летась.**

СТАР. 4

Сумесны праект „Звязды" і Міністэрства па надзвычайных сітуацыях

ЖЫВІЦЕ Ў БЯСПЕЦЫ!

## Непажаданыя насельнікі

### Што робіцца на гарышчах і ў падвалах?

**Тэхнічны паверх у шматпавярховай забудове — вельмі карысная рэч. У невялікім асабістым адсеку можна размясціць рэчы, якія нібыта не вельмі патрэбны, пры гэтым яны не загрувашчваюць прастору ўнутры кватэры. Разам з тым прадметы, якія адпраўляюцца ў «ганаровую ссылку», не заўжды захоўваюцца бяспечна для іншых. Дадаюць тут праблем і асобы без пэўнага месца жыхарства.**



Пра тое, чым небяспечныя пажары ў падвалах і як часта яны здараюцца, карэспандэнт «Звязды» распытаў **афіцыйнага прадстаўніка МНС сталіцы Вольгу МЕЛЬЧАНКА.**

— Людзі без даху над галавой не вельмі любяць гарышчы. Па-першае, у дамах вельмі шмат непажаданых сведак — паспрабуйце ўвесь час хадзіць на дзявяты ці яшчэ вышэйшы паверх так, каб вас ніхто не ўбачыў. А напрыклад, у падвал класічнай «хрушчоўкі» можна зайсці проста з двара. Па-другое, яны заўсёды ідуць туды, дзе можна перачакаць у цяпле, — праз падвал ідуць трубы ацяплення і гарачага водазабеспячэння. Бывае і так, што непажаданыя госці пранікаюць у падвал праз выбітае назіральнае акно ці ўзломваюць замок на дзвярах. Хоць бываюць розныя сітуацыі, — адзначае Вольга Мельчанка.

Сёлета сталічныя падвалы і гарышчы гарэлі ўжо адзінаццаць разоў. На першы погляд, быццам і няшмат. А калі паглядзець больш дэталёва, то такі пажар вельмі небяспечны. Класічны падвал у пяці- ці дзевяціпавярховіку (вядома, там, дзе ён ёсць) — гэта няпэдка складаная сістэма праходаў, якія могуць заканчвацца тупікамі. І кожны такі тупік павінны абследаваць пажарныя, каб упэўніцца, што там нікога няма. Пры пажары чадны газ і дым вельмі істотна памяншаюць шанцы на выратаванне.

СТАР. 3

ISSN 1990 - 763X